# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, БДУ!

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 26 кастрычніка 2006 года, №№ 17-18 (1947-1948)

## БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ — 85!



### Шаноўныя сябры!

***Віншую выкладчыкаў, супрацоўнікаў і ўсіх выхаванцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта са знамянальнай датай — 85-годдзем alma-mater!***

***Для чалавека гэта паважны ўзрост, калі падсумоўваюцца вынікі ўсяго жыцця і дзейнасці. Але для навучальнай установы, мне здаецца, увогуле не павінна існаваць цяжару пройдзеных гадоў, бо вучыць, выхоўваць, даследаваць — гэта заўсёды рух наперад, заўсёды сустрэча з новым, цікавым, а значыць, заўсёднае існаванне ў віры жыцця і маладосці. Безумоўна, наш універсітэт — першы, які быў створаны ў рэспубліцы, — мае сваю багатую гісторыю, дарагую нам славутымі імёнамі заснавальнікаў, першых выкладчыкаў, выдатных выпускнікоў. Гэта наш родны універсітэт — гонар і адзін са значных сімвалаў дзяржавы Беларусь. Мы помнім сваё мінулае і імкнемся быць дастойнымі нашчадкамі і прадаўжальнікамі традыцый класічнага універсітэта, які заўсёды быў і заўсёды будзе флагманам вышэйшай школы краіны.***

***Са святам вас! З днём нараджэння БДУ! З днём, які дае нам новыя надзеі, ідэі і ўпэўненасць у новых дасягненнях! Здароўя, поспехаў і радасці!***

## ПРАГРАМА СВЯТКАВАННЯ

**27 кастрычніка**

12.00 Урачыстае адкрыццё Музея гісторыі БДУ на першым паверсе галоўнага корпуса універсітэта

**30 кастрычніка**

15.00—16.30 Урачысты малебен у гонар 85-годдзя БДУ (Мінскі кафедральны Свята-Духаў сабор). Малебен адслужыць мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

17.00—19.30 Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 85-годдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта, святочны канцэрт (канцэртная зала "Мінск")

**31 кастрычніка**

10.00 Навуковая канферэнцыя, Вучоны савет, дзе адбудзецца ўручэнне прэміяў імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі (зала пасяджэнняў Вучонага савета ў рэктараце БДУ)

17.00—22.00 Студэнцкая танцавальна-забаўляльная праграма "БДУ — 85" (Палац спорту)

ПАДЗЕІ

## НОВЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БДУ

Сапраўдным падарункам да юбілею стане адкрыццё Музея гісторыі БДУ. Першымі, яшчэ да ўрачыстага адкрыцця, яго наведала кіраўніцтва універсітэта, а таксама дэканы ўсіх факультэтаў. Нагадаем, што музей аднаўляе сваю працу пасля дзевяцігадовага перапынку.

Больш падрабязна пра Музей гісторыі, а таксама пра ўсе музеі БДУ чытайце на 5-й старонцы.

Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА



## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Рэктар БДУ прафесар В.І. Стражаў правёў пасяджэнне Савета па адукацыі краін СНД і прыняў удзел у выставах, прысвечаных 15-годдзю СНД. Мерапрыемствы адбыліся 25 кастрычніка ў Маскве.

Сёння Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Сурыкаў сустрэўся са студэнтамі нашага універсітэта.

Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар В.В. Самахвал узяў удзел у канферэнцыі рэктараў балтыйскіх універсітэтаў па праблемах экалагічнай адукацыі, якая прайшла 19—20 кастрычніка ў шведскім горадзе Упсала.

Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар У.Л. Клюня прыняў удзел у юбілейнай міжнароднай асамблеі рэктараў славянскіх універсітэтаў. Сустрэча адбылася 16—18 кастрычніка ў Маскве.

На святкаванні 85-годдзя Белдзяржуніверсітэта чакаюцца каля 100 гасцей з розных ВНУ нашай краіны і замежжа.

Рашэннем рэктарата за плённае супрацоўніцтва з БДУ падчас святкавання юбілею універсітэта будуць узнагароджаны шэраг журналістаў рэспубліканскіх выданняў, а таксама сродкі масавай інфармацыі.

Традыцыйна ў дзень нараджэння БДУ 30 кастрычніка загадам рэктара студэнты будуць вызвалены ад заняткаў. У гэты дзень яны наведаюць святочныя мерапрыемствы.

Урадавую тэлеграму за подпісам намесніка прэм'ер-міністра А.М. Касінца атрымаў БДУ пасля ўдзелу ў XI Міжнароднай выставе "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" (Санкт-Пецярбург). Савет Міністраў Беларусі сардэчна павіншаваў калектывы навукова-даследчых падраздзяленняў універсітэта з атрыманнем 5 залатых, 3 срэбраных медалёў і 3 ганаровых дыпломаў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ


**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**ВАЕННАМУ ФАКУЛЬТЭТУ СПАЎНЯЕЦЦА 80 ГАДОЎ**



Стар. 3

**КНІГА ПРА ГІСТОРЫЮ**



Напярэдадні святкавання 85-годдзя БДУ выходзіць у свет кніга «Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921–1941 гг.» Гісторыя стварэння, а таксама цікавыя ілюстрацыі з выдання на

Стар. 4

**УСЕ Ў МУЗЕІ!**



Знаёмства з музеямі БДУ

Стар. 5

**ЗАПЫТАЕМ У СТУДЭНТАЎ**

Маніторынг па пытаннях навучальнай дзейнасці студэнтаў

Стар. 6

**ТЫДЗЕНЬ З МЕЛЬПАМЕНАЙ**

Фестываль студэнцкай творчасці «Тэатральны куфар–2006»



Стар. 8

ТРАДЫЦЫІ

# ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ ДЛЯ НАШЫХ МАТУЛЬ

Няпроста выхаваць чалавека. Навучыць яго быць адказным, працавітым, цікаўным і ініцыятыўным... Маці студэнтаў БДУ шчаслівыя, бо маюць сведчанне плённасці сваёй працы: іх дзеці патрапілі ў найлепшую ВНУ краіны. Маці студэнтаў-выдатнікаў — шчаслівыя "ў квадраце": не толькі дзеці радуюць поспехамі, а яшчэ і кіраўніцтва універсітэта віншуе!



Сустрэча рэктара БДУ з маці таленавітых студэнтаў адбылася 17 кастрычніка. Перад тым мамы наведалі музей землязнаўства, дзе пазнаёміліся з таямнічым светам камянёў і дакрануліся да самага каштоўнага тут экспаната — кавалка вулканічнай пароды з гары Арарат, які налічвае не менш за 2 мільярды гадоў. У гэты час дзяўчаты і хлопцы паглядзелі экспазіцыю музея гісторыі БДУ — першымі, яшчэ да афіцыйнага адкрыцця музея.

У сэрцы універсітэта — зале пасяджэнняў Вучонага савета — у гэты дзень не абмяркоўваліся пытанні лёсу БДУ. Затое амаль 50 жанчын пачулі самае важнае — словы падзякі за карпатлівую працу выхавання. Рэктар Васіль Стражаў параіў студэнтам цаніць падтрымку сям'і і берагчы маці, самага блізкага чалавека, які гатовы аддаць за дзяцей усё. Мамам жа — распавёў пра тое, як арганізаваны навучальны працэс у БДУ, якія тэхнічныя і метадалагічныя ноу-хау ўводзяцца для спрашчэння студэнцкага жыцця. І павіншаваў з Днём маці, расказаўшы, што сам, як бацька і дзед, ведае, як прыемна, калі дасягненні тваіх нашчадкаў іншыя прызнаюць услых.

Айцец Серафім, першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірылы, перадаў жанчынам прывітанне мітрапаліта Філарэта і нагадаў пра духоўную аснову свята маці, зніта ванага з праваслаўным святам Пакрыва Прасвятой Божай Маці.

Саветнік рэктара У. Навумовіч вершамі беларускіх паэтаў гаварыў пра вернасць універсітэту, роднай староньцы, якая пачынаецца з вернасці маці, сям'і. Сваю творчасць паказаў клуб аўтарскай песні БДУ. Атрымалі мамы і іншыя падарункі: цёплыя словы панеслі дамоў у сэрцах, а ружы і чайныя сервізы — у руках.

Матуля заўсёды верыць у цябе. І хочацца штосьці зрабіць для яе, неяк падзякаваць за любоў, увагу, штодзённы клопат. Сустрэчы з маці таленавітых студэнтаў праводзяцца ва універсітэце ў трэці раз і паспелі ўжо стаць добрай традыцыяй. А традыцыі, па словах Людмілы Горскай, што дзякавала за віншаванне ад імя ўсіх мам, вызначаюць "аблічча" ўстановы. Жыццё складаецца з хвілін шчасця, і ў БДУ дарыць адно аднаму такія хвіліны не лянуюцца.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ВІНШУЕМ!

# ЛАЎРЭАТЫ ПРЭМІЙ ІМЯ ПІЧЭТЫ І СЕЎЧАНКІ

Прэмію імя У.І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук атрымалі кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца кафедры класічнай філалогіі філалагічнага факультэта Галіна Іванаўна Шаўчэнка (за манаграфію "Фразеалагізмы антычнага паходжання ў славянскіх мовах") і доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта Ізабела Іванаўна Марціновіч (за сукупнасць навуковых работ па перспектыўных напрамках, прысвечаных судоваму ладу, адвакатуры і судова-прававой рэформе Беларусі).

Прэмію імя А.Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук падзялілі паміж сабой два калектывы:

за цыкл работаў "Мадэляванне тэхналагічных працэсаў і прыборных структураў мікра- і нанаэлектронікі" — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, загадчык лабараторыі эліёнікі навукова-даследчай установы "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі" БДУ Фадзей Фадзеевіч Камароў, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры фізічнай электронікі факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзімір Міхайлавіч Бардзоў, доктар фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі эліёнікі навукова-даследчай установы "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі" БДУ Аляксандр Фадзеевіч Камароў;

за цыкл работаў "Працэсы атрымання з раствораў плёнак металаў, сплаваў і кампазітаў з рэгуляванымі складам, структурай, уласцівасцямі" — доктар хімічных навук, прафесар кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта Таццяна Мікалаеўна Вараб'ёва, кандыдат хімічных навук, старшы навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара па навуковай рабоце ўстановы БДУ "Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем" Таццяна Васільеўна Гаеўская, кандыдат хімічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік установы БДУ "Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем" Ларыса Іванаўна Сцяпанава.

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# ВЫСТАВА ДАСЯГНЕННЯЎ БДУ

***Юбілейная выстава дасягненняў Белдзяржуніверсітэта ў галіне навукі і адукацыі адкрылася 23 кастрычніка ў будынку рэктарата. У экспазіцыі прадстаўленыя 80 экспанатаў, згрупаваных па сямі раздзелах.***



У раздзеле "Экалогія, бяспека жыццядзейнасці" можна пабачыць фільтры на аснове плёнкава-тканінных матэрыялаў і сарбенты для ачысткі вадкасцяў, тэст-сістэму для вызначэння наркатычных і псіхатропных рэчываў, іонаабменныя валакністыя матэрыялы ФІБАН, саставы для гашэння лясных і тарфяных пажараў.

Раздзел "Медыцына" знаёміць з апаратна-праграмнымі комплексамі для медыцынскай дыягностыкі, біямеханічнымі стымулятарамі для нарошчвання функцыянальнай цягліцавай масы і сілы (БСТУ), хуткараспадальнымі лекавымі прэпаратамі і серыяй прэпаратаў афтальмалагічнага прызначэння "Мультырол".

У раздзеле "Сельская гаспадарка, харчовая прамысловасць" цікаўныя пазнаёмяцца з біяпрэпаратамі для абароны раслінаў, ветэрынарнымі прэпаратамі для лекавання мікраэлементозаў жывёл, харчовымі дабаўкамі для пякарнай прамысловасці ды інш.

Стэнд "Рэчывы, пакрыцці і матэрыялы" прэзентуе дызельнае біяпаліва з рапсавага алею, новыя сцынтыляцыйныя матэрыялы, тэхналогіі атрымання люстраных паверхняў звышвысокай чысціні на металах, парашкі і праяўляльнікі для дактыласкапіі, а таксама іншыя экспанаты.

Раздзел "Рэсурс- і энергазберажэнне" знаёміць з ультрагукавымі лічыльнікамі газу, вадкасці і колькасці цеплыні, а таксама з цеплаізаляцыйнымі вырабамі з цвёрдых пенаполіурэтанаў.

"Кантрольныя і вымярэнчыя прылады" называецца раздзел, дзе можна ўбачыць партатыўную сістэму маніторынгу машыннага абсталявання, прыборы для аналізу складу і якасці нафтапрадуктаў, камп'ютарна-арыентаваныя прыборы для радыёэлектронікі.

Акрамя таго, у асобным раздзеле можна ўбачыць навуковыя выданні факультэтаў гуманітарнага профілю — юрыдычнага, філалагічнага, гістарычнага і міжнародных адносін.



**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# "БЕЛАРУСЬ" НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ

***Больш за 50 распрацовак паказаў БДУ ў рамках Нацыянальнай выставы "Беларусь 2006", якая праходзіла ў Кіеве з 11 па 14 кастрычніка.***

Экспазіцыя універсітэта ўключала прадукцыю па разнастайных тэмах: геаінфармацыйная сістэма для стварэння і вядзення картаграфічных і атрыбутыўных баз даных MAP MANAGER і яе дастасаванні для нафтаразведкі, аналізатар якасці аўтамабільнага бензіну і інш., камп'ютарна-арыентаваныя сродкі вымярэння, СВЧ-кампаненты, абсталяванне для вытворчасці цеплазберагальных вырабаў, ахова навакольнага асяроддзя і экалогіі, тэхналогіі і рэчывы для сельскай гаспадаркі, узбагачальныя дабаўкі для харчовай прамысловасці і касметалогіі, ахова здароўя, новыя матэрыялы, фота- і электрахімія.

Дарэчы, сёлета навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была прадстаўлена на аналагічных выставах у Краснадары, Чалябінску і Самары. Неўзабаве з распрацоўкамі даследчыкаў БДУ змогуць азнаёміцца Астана і Рыга.

**Лейла ІСМАІЛАВА**

# САЦЫЁЛАГІ ДАСЛЕДУЮЦЬ ГРАМАДСТВА

***Міжнародная навуковая канферэнцыя "Сучаснае грамадства як праблемнае поле сацыяльных навук", прысвечаная 85-годдзю БДУ, адбылася 19 кастрычніка.***

Удзельнікамі мерапрыемства сталі каля 200 навукоўцаў і спецыялістаў у галіне сацыялогіі з БДУ, БДСГА, Акадэміі кіравання, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, ГрДУ і ВДМУ, а таксама госці з Расіі і Польшчы. Праца адбывалася ў чатырох секцыях — "Сацыяльна-культурныя рэаліі сучаснага грамадства", "Тэорыя, метадалогія, метады даследавання сучаснага грамадства", "Праблема чалавека ў сучасным грамадстве", "Грамадства і адукацыя XXI стагоддзя".

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# У АНТАРКТЫДУ!

Два прадстаўнікі нашай краіны, выпускнікі БДУ Аляксей Гайдашоў і Леанід Турышаў упершыню прымуць удзел у штогадовай расійскай Антарктычнай экспедыцыі, якая стартавала 25 кастрычніка. Дарэчы, Л. Турышаў і цяпер працуе ў БДУ — у Нацыянальным навукова-даследчым цэнтры маніторынгу азонасферы. Экспедыцыя 6 месяцаў прабудзе на самым халодным мацерыку Зямлі.

# НА ФІНАЛ У САН-ДЫЕГА

Пяцікурснік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Іван Мяцельскі адзіны з нашай краіны выйшаў у фінал міжнароднага конкурсу праграмістаў "Top Colder Collegiate Challenge–2006", які пройдзе 14—18 лістапада ў г. Сан-Дыега (ЗША). У адборачным туры нашаму фіналісту давялося спаборнічаць у складанні алгарытмаў і праграм са студэнтамі і аспірантамі з вядучых ВНУ свету. У заключным этапе прымуць удзел 48 канкурсантаў з Польшчы, Расіі, Кітая, Галандыі, Славакіі, ЗША, ПАР, Харватыі ды іншых краінаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# ЭКСКУРСІЯ Ў ПАРЛАМЕНТ

Гасцямі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сталі 16 кастрычніка студэнты нашага універсітэта. Такі візіт быў арганізаваны ўжо шосты раз паводле ініцыятывы цэнтра педагагічных тэхналогій студэнцкага гарадка БДУ. Сёлета ў экскурсійную групу ўвайшлі не толькі маладзёжныя актывісты, але і простыя студэнты, якіх зацікавіў заканатворчы працэс. Падчас экскурсіі студэнты пазнаёміліся з гісторыяй парламентарызму ў Беларусі, працэдурай прыняцця законапраектаў, работай дэпутацкага корпусу, структурай дзяржаўных органаў, ажыццяўленнем кантрольных паўнамоцтваў і работай у выбарчых акругах.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВІНШУЕМ!

# ВАЕННАМУ ФАКУЛЬТЭТУ – 80!



Ваенны факультэт БДУ займаецца падрыхтоўкай ваенных кадраў для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і іншых ваенных фарміраванняў ужо 80 гадоў.

4 лістапада 1926 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце была створана ваенная кафедра, з якой і пачалася гісторыя ваеннага факультэта. Першым кіраўніком кафедры стаў палкоўнік М. Пятроў, які быў прызначаны на гэтую пасаду для ваеннага навучання пралетарскага студэнцтва. У 1926—1931 г. камандзір кавалерыйскага палка (а пасля і маршал Савецкага Саюза, чатыры разы Герой Савецкага Саюза) Георгій Жукаў выкладаў на ваеннай кафедры БДУ курс "Вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка студэнтаў". У тыя часы Жукаў праходзіў службу ў Беларускай ваеннай акрузе. Складнікамі ваеннай падрыхтоўкі тады была як ваенная справа, якую вывучалі ўзімку на працягу 4 вучэбных курсаў, так і двухмесячная летняя практыка.

Дарэчы, на ваеннай кафедры БДУ праходзілі службу многія Героі Савецкага Саюза. Гэта і палкоўнік А. Патрын, які быў у 1950-х начальнікам па вучэбнай частцы, і генерал-маёр А.В.Кірсанаў — кіраўнік спецкафедры з 1955 г. па 1960 г., а пазней прарэктар БДУ.

11 чэрвеня 2003 г. паводле Пастановы Савета Міністраў Беларусі "Аб ваенных факультэтах на ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь", Пастановы Міністэрства абароны і Міністэрства адукацыі ад 7 жніўня 2003 г. №54/59 "Аб ваенных факультэтах установ РБ" ваенная кафедра была рэарганізавана ў ваенны факультэт БДУ. З 2003 года і па сённяшні кіраўніком з'яўляецца палкоўнік У.М. Леўшык.

Згодна з "Палажэннем аб ваенным факультэце БДУ", ваенны факультэт — структурнае падраздзяленне нашага ўніверсітэта. Яно было створана для падрыхтоўкі кадравых афіцэраў, малодшых ваенных спецыялістаў і афіцэраў запасу розных вайсковых фарміраванняў нашай краіны. А вось ваенная кафедра рыхтавала афіцэрскія кадры запасу толькі для Узброеных Сіл.

На сённяшні ваенны факультэт БДУ складаецца з 7 структурных падраздзяленняў: камандавання, кафедры супрацьпаветранай абароны, кафедры баявога прымянення артылерыі, вучэбнай часткі, батальёна курсантаў і аддзялення забеспячэння навучальнага працэсу, агульнавайсковай кафедры. А падрыхтоўка курсантаў на факультэце вядзецца па 6 спецыяльнасцях: псіхалогія (спецыялізацыя — маральна-псіхалагічнае забеспячэнне вайсковай дзейнасці), хімія (напрамак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная ахова), журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка), правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая праца ў ваеннай сферы), міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы), геаграфія (напрамак — геаінфармацыйныя сістэмы, спецыялізацыя — ГІС ваеннага прызначэння). Таксама факультэт вядзе падрыхтоўку афіцэраў запасу па 9 спецыяльнасцях, а малодшых ваенных спецыялістаў — па 12.

Як бачыце, нават васьмідзесяцігадовы ўзрост не перашкаджае актыўна працаваць у многіх напрамках, рыхтаваць сапраўдных спецыялістаў і абаронцаў радзімы.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**



ПАДЗЕІ

# У АГНІ НЕ ЗГАРЫМ І Ў ВАДЗЕ НЕ ПАТОНЕМ

***12 кастрычніка гатоўнасць супрацоўнікаў нашага універсітэта да дзеянняў у надзвычайных сітуацыях была праверана на практыцы. У гэты дзень у БДУ прайшлі комплексныя вучэнні на тэму "Арганізацыя і правядзенне аварыйна-выратавальных і іншых неадкладных работ па ліквідацыі вынікаў аварый, катастроф і стыхійных бедстваў".***



У вучэннях прынялі ўдзел каля 300 чалавек. Сярод іх былі прадстаўнікі камісій па надзвычайных сітуацыях, эвакуацыйнай камісіі па ўстойлівасці функцыянавання універсітэта. Неваенізаваныя фарміраванні грамадзянскай абароны, куды ўваходзяць санітарныя дружыны геафака, група абароны грамадскага парадку ваеннага факультэта, сувязісты з факультэта радыёфізікі і электронікі, пост радыяцыйнага і хімічнага назірання хімфака таксама ўдзельнічалі ў мерапрыемстве. Своеасаблівае навучанне прайшлі супрацоўнікі адміністрацыйнага будынка па вуліцы Бабруйскай, 7. Нават прэс-служба БДУ не засталася ўбаку і была своечасова эвакуіравана.

Кожная з груп удзельнікаў мела свае задачы. Адным трэба было прадэманстраваць здольнасць ацэньваць абставіны і хутка прымаць рашэнні па абароне студэнтаў і супрацоўнікаў у надзвычайных сітуацыях, другім — навучыцца зладжана дзейнічаць па сігналах грамадзянскай абароны і карыстацца індывідуальнымі сродкамі абароны. Удзельнікі вучэнняў прадэманстравалі на манекенах, як правільна спыняць крывацёк і рабіць штучнае дыханне. Акрамя таго супрацоўнікі і студэнты БДУ зладзілі экскурсію да мемарыяльнага комплексу "Лінія Сталіна".

Найлепшых вынікаў дасягнулі санітарная дружына геаграфічнага факультэта (камандзір — Данііл Тварановіч, асістэнт кафедры дынамічнай геалогіі геаграфічнага факультэта), звяно сувязі факультэта радыёфізікі і электронікі пад камандаваннем загадчыка лабараторыі кафедры фізікі Аляксандра Спірыдонава. Зладжана дзейнічала група аховы грамадскага парадку ваеннага факультэта (камандзір — падпалкоўнік Аляксей Матузаў). Сярод іншых таксама вылучыўся дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі хімфака Вячаслаў Касабудскі — камандзір паста радыяцыйнага і хімічнага назірання.

Дарэчы, за сваю работу штаб грамадзянскай абароны Белдзяржуніверсітэта ў мінулым годзе атрымаў I месца сярод прадпрыемстваў, установ і ВНУ Маскоўскага раёна Мінска. Ён быў узнагароджаны пераходным кубкам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях РБ.



**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**
**Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# СВЯТА НА СПАРТЫЎНАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

***Здаецца, ужо хутка ў насычаным жыцці універсітэта з'явіцца яшчэ адна традыцыя — міжвузаўская спартакіяда сярод супрацоўнікаў і выкладчыкаў, якая сёлета адбылася 6—8 кастрычніка ў спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна". Мерапрыемства было наладжана з ініцыятывы прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БДУ.***




Ужо другі год прадстаўнікі БДУ, БДПУ, БДЭУ, БНТУ, а таксама БДУІР сабраліся разам пад Радашковічамі, каб высветліць, чые кадры здаравейшыя і дужэйшыя. Упершыню ўдзельнічаў у гэтай спартакіядзе Мінскі лінгвістычны універсітэт. Ва ўрачыстым адкрыцці прыняло ўдзел кіраўніцтва БДУ, бо спаборніцтва было прысвечана дню нараджэння нашага універсітэта.

У САК "Брыганціна" прыехалі 210 спартсменаў, якія спрабавалі сабе ў міні-футболе, валейболе, настольным тэнісе, плаванні і шахматах. Паза праграмай адбыліся спаборніцтвы па гульні ў дартс.

На спартыўнай пляцоўцы, як кажа старшыня прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БДУ Яўген Пятровіч Турамша, панавала жаданне перамагчы разам з павагай да калег з каманды-канкурэнта. Але знайшліся і несумленныя ўдзельнікі, якія замест супрацоўнікаў свайго універсітэта ўключалі ў каманды прафесійных спартсменаў. На гэтым злачынстве былі злоўленыя каманды педагагічнага і эканамічнага універсітэтаў. Нават гэтыя падставы не дапамаглі ім перамагчы ў спаборніцтве. Абсалютным чэмпіёнам стаў Беларускі дзяржаўны універсітэт, срэбра забрала каманда БНТУ, а бронзу — БДЭУ.

**Лейла ІСМАІЛАВА**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

ПАДЗЕІ

# КНІГА ПРА ГІСТОРЫЮ


Вокладка кнігі «Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921–1941»


Першы рэктар БДУ У.І.Пічэта. 1920-я гг.

Як вучыліся студэнты, якія першымі пераступілі парог БДУ? Якія курсавыя работы пісалі ўначы? Ці парушалі правілы карыстання інтэрнатам? Як бавілі вольны час? Адкуль універсітэт браў паліва ўзімку? Ці адпраўлялі прафесараў у камандзіроўкі за мяжу ў рэпрэсіўныя 30-я? Пра студэнцкае жыццё, надзённыя клопаты, пакуты і дасягненні універсітэта за першыя 20 год яго існавання чытайце ў кнізе “Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921—1941”. Яна выходзіць у свет у серыі “Memoria et Gloria” (“Памяць і слава”).

Гістарыяграфія БДУ складаецца са шматлікіх кніг і артыкулаў, што выходзілі да юбілейных дат, пачынаючы ад першых угодкаў універсітэта 30 кастрычніка 1922 г. Першы рэктар У. Пічэта быў і першым гістарыёграфам універсітэта, прыгадайма яго артыкул “Беларускі дзяржаўны універсітэт напярэдадні 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі”. Гістарычныя даследаванні распачалі першыя выпускнікі, кшталту Ф. Турука, аўтара артыкула “Універсітэцкі летапіс”. Дзякуючы колькасці гэтых даследаванняў і актыўнасці, з якой наша alma mater прымала ўдзел у грамадскім жыцці краіны, атрымаць поўнае ўяўленне пра шматбаковую дзейнасць універсітэта стала складана: жадаючым давялося б папрацаваць у бібліятэках і архіўных фондах, пазнаёміцца са стосамі дакументаў. На шчасце, гэтую працу за нас ужо зрабілі складальнікі кнігі “Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921−1941” на чале з С.М. Ходзіным, М.Ф. Шумейкам і А.А. Яноўскім. Яны сістэматызавалі дакументы пра універсітэт па раздзелах, выбралі самае цікавае і значнае, да кожнага раздзела прыклалі ўступныя артыкулы — гартайце старонку за старонкай і пераконвайцеся, што развіццё БДУ ішло разам з развіццём беларускай дзяржавы і не было якой-небудзь значнай падзеі ў гісторыі краіны, якая б не закранула лёсу універсітэта. Напрыклад, барацьба з так званымі “нацдэмамі” разгарнулася ў канцы 20-х: хваля рэпрэсій захліснула і БДУ, разам з іншымі прафесарамі і выкладчыкамі быў арыштаваны У. Пічэта.

Крыніцамі па гісторыі універсітэта сталі пратаколы пасяджэнняў Праўлення і Савета БДУ, а таксама справаздачы, дакладныя запіскі, звароты ў розныя інстанцыі па пытаннях матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння ВНУ, судова-следчыя матэрыялы і г.д. Мовай дакументаў створана аб’ектыўная карціна мінулага.

Кніга “Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921−1941” выйдзе напярэдадні святкавання 85-годдзя БДУ і папоўніць серыю выданняў, прысвечаных гісторыі БДУ.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**


Анкета студэнта БДУ, дэлегата I Усебеларускага з’езда паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» Кандрата Крапівы. 1925 г.


Студэнт фізіка-матэматычнага аддзялення педфака БДУ А.Н.Сеўчанка. Канец 1920-х – пачатак 1930-х гг. (Рэктар БДУ ў 1957–1972 гг.)


Заява Якуба Коласа на працу ў БДУ. 28 верасня 1923 г.


Будынкі хімфака БДУ і анатамічнага корпуса Медыцынскага інстытута. 1933 г.


Члены Маскоўскай камісіі садзейнічання стварэнню БДУ. 1920 г.


У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы. Канец 1930-х гг.

## ПАМЯЦЬ І СЛАВА БДУ

***Серыя кніг “Memoria et Gloria” (“Памяць і слава”) паводле прапановы кандыдата філалагічных навук Г. Шаўчэнка заснавана і зацверджана Рэдакцыйна-выдавецкім саветам БДУ ў 2003 г. Тады і была акрэслена задача серыі — знаёміць з навуковай спадчынай, ствараць яркія запамінальныя партрэты вучоных, педагогаў па ўспамінах калег, сучаснікаў, расказваць аб гераічным мінулым і дні сённяшнім універсітэта.***

Серыю адкрыла кніга, якая прысвячалася 75-годдзю з дня нараджэння знакамітага філолага-славіста, педагога Адама Яўгенавіча Супруна. Шмат папрацавалі рэдакцыйная калегія, складальнікі і супрацоўнікі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы над распрацоўкай серыйнага афармлення, зместам, структурай кнігі.

І як вынік напружанай творчай працы штогод пачалі з’яўляцца арыгінальныя і змястоўныя кнігі “Фёдар Макаравіч Нячай. Да 100-годдзя з дня нараджэння”, “Фёдар Іванавіч Фёдараў. Да 95-годдзя з дня нараджэння”. Гэтыя кнігі вельмі добра былі ўспрыняты навуковай супольнасцю універсітэта і краіны, калегамі з замежжа, з захапленнем і ўдзячнасцю — сваякамі.

Не дзіўна, што напярэдадні святкавання 60-годдзя Вялікай Перамогі кнігу “Беларускі дзяржаўны універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) гг.” было вырашана выдаць у серыяльным афармленні. Кніга атрымалася ўрачыстая і змястоўная.

Плануецца выпусціць у свет пяць кніг, якія адлюстроўваюць гісторыю БДУ ад дня стварэння да сучаснасці.

Цяпер завяршаецца работа над кнігай, прысвечанай акадэміку НАН Беларусі, выдатнаму навукоўцу БДУ В.В. Свірыдаву.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**


Выкладчыкі БДУ (пачатак 1930-х гг.).


Першыя студэнты БДУ. 1923 г.


Ва універсітэцкім дворыку. 1930 г.


Былы галоўны корпус БДУ. 1934 г.


Панарама Універсітэцкага гарадка. 1936 г.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# УСЕ Ў МУЗЕІ!

***Інфармацыя раскладзена па палічках, пісьмовы каментарый і жывы каментатар да вашых паслуг... Не, вы не марыце, вы проста патрапілі ў музей. Хаця музеі БДУ сапраўды можна назваць марай любога студэнта. Здольныя забяспечыць вас ведамі на патрэбную тэму, размешчаныя з улікам прафесіі, якую вы набываеце, багатыя на унікальныя экспанаты і запамінальныя калекцыі, музеі alma mater адчыняюць перад вамі дзверы.***

## ГІСТОРЫЯ ПРА ГІСТОРЫЮ

У 1924 г. у БДУ намаганнямі прафесараў М. Доўнар-Запольскага і С. Кацэнбогена распачаў сваю дзейнасць музей першабытнай гісторыі і рэлігіі. Старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія статуі, маскі, вазы і іншыя экспанаты для музея кіраўніцтва БДУ набывала ў Эрмітажы. Напрыканцы 20-х — на пачатку 30-х збор музея папаўнялі археалагічныя і этнаграфічныя экспедыцыі. У 1940 г. установа была рэарганізаваная ў гісторыка-археалагічны музей, сюды прыходзяць матэрыялы з раскопак старажытнагрэчаскіх гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я. Падчас вайны фонды і калекцыі былі разрабаваныя, пасляваеннае аднаўленне пачалося з экспазіцыі антычнай культуры, а затым былі сфармаваныя археалагічны аддзел і аддзел культуры Старажытнага Усходу. 1959 г. адзначыў стварэнне пры кафедры гісторыі БДУ гісторыка-археалагічнага музея.



У 1951 г. адбылася выстава дасягненняў універсітэта за 30 гадоў дзейнасці. Узнікла патрэба ў падраздзяленні, што занялося б зборам і захаваннем матэрыялаў па гісторыі універсітэта. Праз 18 гадоў пошукавай работы выкладчыкаў і студэнтаў гістарычнага факультэта ў гісторыка-археалагічным музеі быў створаны аддзел гісторыі БДУ. Да 60-годдзя універсітэта аддзел быў рэканструяваны ў музей гісторыі БДУ, ягоныя плошчы значна пашырыліся. У 1995 г. была падрыхтавана новая экспазіцыя, з музея гісторыі БДУ была вылучана Вучэбная лабараторыя музейнай справы гістарычнага факультэта, якая мае аддзелы археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, антычнасці і Старажытнага Усходу. Першыя два складаюцца пераважна з экспанатаў, сабраных падчас экспедыцый гістарычнага факультэта. Аддзелу нумізматыкі, створанаму ў 1964 г. прафесарам В. Рабцэвічам, пазайздросціць кожны гістарычны музей: тут экспануюцца скарбы і сістэматычная калекцыя манет ад антычнасці да XVIII ст. Найбольш каштоўным з'яўляецца знакаміты Вішчынскі скарб, знойдзены студэнтамі падчас археалагічнай практыкі.

1997 г. стаў знакам сумнай падзеі для музея гісторыі БДУ — экспазіцыя, што атрымлівала найлепшыя водгукі наведнікаў, закансервавана, экспанаты патрапілі на захаванне ў невялікі пакойчык на факультэце даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. У юбілейны для універсітэта 2006 г. падрыхтавана новая музейная экспазіцыя, якая адлюстроўвае гісторыю БДУ ад часоў заснавання. Яе адкрыццё прымеркавана да святкавання 85-годдзя універсітэта.



## УНІКАЛЬНАЯ ЗААЛАГІЧНАЯ КАЛЕКЦЫЯ

Заалагічны музей біялагічнага факультэта — аднагодак універсітэта. Створаны ў 1921 г. з ініцыятывы прафесара А. Фядзюшына, музей пачаў камплектаванне і навуковую апрацоўку заалагічных калекцый. Пазней экспазіцыйную частку ўдасканалілі — і ўшчыльную заняліся экалагічнай адукацыяй студэнтаў, папулярызацыяй ідэй аховы прыроды, паглыбленнем навучэнскіх ведаў у сістэматыцы, марфалогіі, заагеаграфіі ды іншых дысцыплінах. Патрэба гэтай навукова-асветніцкай работы пацвярджаецца колькасцю наведнікаў: на працягу года пазнаёміцца з самай вялікай у краіне заалагічнай калекцыяй прыходзяць амаль 10 тысяч чалавек. Вучні, студэнты, навуковыя супрацоўнікі ўстаноў Беларусі і іншых краін завітваюць у навучальна-лабараторны корпус па вул. Курчатава, 10, каб пабачыць на свае вочы фрагменты выкапнёвых жывёл, 260 відаў жывёл, занесеных у Чырвоныя кнігі свету. За апошняе дзесяцігоддзе экспазіцыйны фонд папоўніўся такімі рэдкімі відамі, як чырвоны воўк, вандроўны альбатрос, гіяцынтавы ара, шымпанзэ, а таксама шматлікімі трапічнымі насякомымі і шэрагам іншых, аналагаў якім у прыродазнаўча-гістарычных музеях Беларусі няма. Сабраны тут і серыі новых для навукі відаў, захоўваюцца унікальныя экспанаты XIX—XX ст., напрыклад, жывёлы-мутанты з ненатуральнай афарбоўкай покрыва. Разнастайнасць фаўны свету прадстаўлена ў музеі амаль 110 тысячамі адзінак захавання (чучалы, кладкі птушак, прэпараты, астэалагічны матэрыял і інш.), штогод асноўны фонд папаўняецца на 1100 адзінак.



## ПРАВАЗНАЎСТВА ПАД ШКЛОМ

У 1986 г. сустрэў першых цікаўных музей гісторыі юрыдычнага факультэта БДУ. Падрыхтаваная намаганнямі прафесара І. Гарэліка і дацэнта Н. Бабія экспазіцыя давала ўяўленне пра дачыненні факультэта і БДУ (вылучэнне, самастойнае існаванне ў якасці інстытута, аб'яднанне), змяшчала прававыя дакументы, што сталі знакавымі ў гісторыі юрыспрудэнцыі краіны. Далейшым узбагачэннем калекцыя абавязана студэнцкай групе "Пошук". У старым будынку музей туліўся ў адным пакоі, частка экспазіцыі чакала студэнтаў проста на калідоры. Новы будынак факультэта вылучыў пад музей залу, дзе размясціліся гістарычныя фотаздымкі, граматы і іншыя сведкі часу. Адзін са шматлікіх талентаў загадчыцы музея дацэнта Лідзіі Максімавай — ствараць з дапамогай экспанатаў атмасферу эпохі. Так, у гістарычнай "вандроўцы" ад заснавання факультэта да сучаснасці ёй дапамагаюць каляндарык 20-х, гадзіннік 30-х, штык-каскі 40-х, пісьмовыя прылады 50-х, патэфон, які толькі ў 60-я пачаў пакідаць кватэры нашых бабуль... У "экспанаты" музея трапляюць найлепшыя навучэнцы юрфака, алімпійскія чэмпіёны, студэнты-"афганцы" — тут памятаюць усіх, хто ўзняўся над уласным лёсам, каб зрабіць свой унёсак у гісторыю.

Экскурсія звычайна завяршаецца ля помніка ВАВ, дзе змешчаны прозвішчы выкладчыкаў і студэнтаў, якія аддалі жыццё за радзіму. Іх памяць шануюць хвілінай маўчання.

У апошнія гады экспазіцыя пашырылася за кошт выставы "Кафедры": наведнікі могуць пазнаёміцца з гісторыяй кожнай кафедры і лабараторыі факультэта, выкладчыкамі і іх навуковымі працамі.

На базе музея арганізуюць сустрэчы з кіраўнікамі праваахоўчых органаў краіны.



## БОЛЬШ ЧЫМ КАМЯНІ

Найбуйнейшы ў краіне навуковы, культурна-асветніцкі і метадычны цэнтр па вывучэнні камянёў — музей землязнаўства — знаходзіцца на геаграфічным факультэце БДУ. Заснаваны ў 1934 г., сёння музей налічвае 20 тысяч экспанатаў. Асновай была прыватная калекцыя горных парод і мінералаў, падараваная акадэмікам І. Бліядухам. У 60-я музей пабагацеў на калекцыі, сабраныя падчас экспедыцый на Урал, у Казахстан, Сярэднюю Азію, Украіну і Усходнюю Сібір. Шмат цікавага з'явілася тут за апошнія гады.

Школьнікі, студэнты, замежныя госці — хто б ні завітаў у музей, усіх чакае адаптаваная да іх узроўню ведаў экскурсія. Праводзяцца пасяджэнні геалагічных гуртkoў, канферэнцыі — веды пра Зямлю супрацоўнікі музея намагаюцца падаваць у самых разнастайных займальных формах. Да таго ж, музей — актыўны арганізатар і ўдзельнік мінералагічных выстаў. Праведзена ўжо 28 міжнародных выстаў "Каменная казка", больш за 30 выстаў "Таямнічы свет камянёў" у Мінску і іншых гарадах Беларусі. Кожны год у розных формах работы музея ўдзельнічае звыш 20 тысяч студэнтаў, школьнікаў, педагогаў і гасцей горада. З 1994 г. музей землязнаўства ўключаны ў міжнародны даведнік па мінералагічных калекцыях "World Directory of Mineral Collections" і з'яўляецца членам асацыяцыі мінералагічных музеяў краін СНД.

Гонарам музея стала калекцыя агатаў з радовішчаў Чукоткі, Манголіі, Бразіліі, Урала, Сібіры і іншых месцаў. Не менш цікавая калекцыя беларускага крэменю і ўзоры палеанталагічнага аддзела, асабліва тыя, што знойдзены ў Беларусі.

На геаграфічным факультэце на другім паверсе красуецца арыгінальная геалагічная алея, складзеная з горных парод, якія выкарыстоўваюць у БДУ для ўпрыгожвання будынкаў.

## ФАЛЬКЛОРНАЯ "НАША ХАТА"

Самы малады з музеяў БДУ, фальклорна-этнаграфічны кабінет-музей на філалагічным факультэце, прапанаваў першую экспазіцыю ў красавіку 2006 г. Завітаць у "Нашу хату" можна было на філфаку падчас канферэнцыі "Фальклор і сучасная культура". Да 85-годдзя БДУ падрыхтаваны дзве экспазіцыі — "Побыт і культура нашых продкаў" і "Вырабы сучасных беларускіх майстроў".

За нядоўгі час існавання кабінет-музей паспеў распрацаваць больш за 50 краязнаўчых маршрутаў па Беларусі для студэнтаў, прапанаваць дапамогу ў складанні экскурсійных маршрутаў школам, ліцэям і гімназіям, заняцца напісаннем сцэнарыяў народных свят і абрадаў. Плануецца стварыць тэатральную студэнцкую суполку. У кабінеце-музеі ладзяцца навуковыя канферэнцыі, сустрэчы з беларускімі мастакамі — захавальнікамі традыцый народнай культуры, з творчымі калектывамі. Майстры народнай творчасці даюць тут майстар-класы для студэнтаў і выкладчыкаў. Навучэнцаў забяспечваюць неабходнай літаратурай на папяровых і электронных носьбітах, таксама можна атрымаць навуковую кансультацыю ад адзінага ў БДУ доктара навук — фалькларыста І. Казаковай, прафесара кафедры беларускай літаратуры і культуры, якая з'яўляецца ініцыятарам стварэння кабінета-музея.

***

У адным з музеяў у кнізе, дзе наведнікі пакідаюць свае ўражанні ад убачанага і пачутага, ёсць надпіс "Хіба можна называць сябе відушчым, калі не ведаеш гісторыі?". У музеях БДУ можна палепшыць свой гістарычны зрок, пашырыць кругагляд і з мінімумам высілкаў атрымаць максімум ведаў.

**Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**



З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ЗАПЫТАЕМ У СТУДЭНТАЎ

***З 2005 г. Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта праводзіць маніторынг па пытаннях навучальнай дзейнасці студэнцкай моладзі II і IV курсаў БДУ. Мэтай гэтага маніторынгу з'яўляецца вывучэнне матываў паступлення студэнтаў у БДУ, іх чаканняў ад навучальнай дзейнасці, меркавання пра якасць навучання, задаволенасці рознымі бакамі навучальнага працэсу. Маніторынг таксама мае на ўвазе выяўленне навыкаў і ўзроўню самастойнай і навукова-даследчай работы студэнтаў, высвятленне, у якіх формах навуковай работы яны прымаюць удзел, якія формы самастойнай работы лічаць найбольш прадуктыўнымі і ці ёсць у студэнтаў умовы і магчымасці займацца навукова-даследчай і самастойнай работай.***

Сацыялагічныя даследаванні ладзіліся ў верасні 2005 г. і 2006 г. Збор звестак ажыццяўляўся метадам раздатачнага анкетнага апытання адначасова на ўсіх факультэтах БДУ. У 2005 г. былі апытаныя 882 студэнты: 484 — на другім курсе, 398 — на чацвёртым; у 2006 г. — 842 студэнты (463 і 479, адпаведна).

Параўнаўчы аналіз вынікаў сацыялагічных даследаванняў паказаў, што пры паступленні ў БДУ студэнты і II, і IV курсаў кіраваліся пераважна такімі

### *Структура матываў выбару БДУ студэнтамі II курса*




характарыстыкамі універсітэта, як яго прэстыжнасць, высокі ўзровень выкладання, магчымасць атрымаць адпаведную спецыяльнасць, а таксама тым, што дыплом БДУ дае магчымасць зрабіць кар'еру, заняць добрую пасаду (графікі 1, 2).

І ў 2005, і ў 2006 г. рэспандэнты пацвердзілі, што навучанне ў ВНУ дае магчымасць авалодаць многімі ведамі, навыкамі і ўменнямі.

На думку студэнтаў II курса, навучанне ў ВНУ забяспечвае найперш:

— неабходны ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці (92,7 % студэнтаў у 2005 г.; 94,6% — у 2006 г.);

— уменне самастойна папаўняць веды і выкарыстоўваць іх на практыцы (90,3 % — 2005 г.; 90,1 % — 2006 г.);

— высокую агульнакультурную эрудыцыю (83,2 % — 2005 г.; 81,4 % — 2006 г.);

— неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці (75 % — 2005 г.; 75,6 % — 2006 г.);

— досвед навукова-даследчай работы (75 % — 2005 г.; 76,3 % — 2006 г.);

— навыкі работы з камп'ютарам (74,1 % — 2005 г.; 70,9 % — 2006 г.);

— неабходныя камунікацыйныя і кіраўніцкія навыкі (70,4 % — 2005 г.; 65 % — 2006 г.);

— веды замежнай мовы (66,7 % — 2005 г.; 65 % — 2006 г.);

— маральнае выхаванне (63,5 % — 2005 г.; 59,2 % — 2006 г.).

Студэнты II курса часцей схільныя меркаваць, што навучанне ў ВНУ забяспечвае неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці, чым студэнты IV курса, у якіх гэты паказчык складае 53,7 % (2005 г.), 52,2 % (2006 г.). Варта зазначыць, што такая тэндэнцыя назіраецца ў ацэнцы забеспячэння ў ВНУ навыкаў работы з камп'ютарам (адпаведна, 58 % у 2005 г. і 62,9 % у 2006 г.), досведу навукова-даследчай работы (65,1 % і 68,9 %) і ведаў замежнай мовы (48,3 % і 51,4 %).

Сярод ведаў і навыкаў, важных для будучай работы, студэнтам II курса пакуль не хапае:

— ведаў замежных моваў (61,2 % у 2005 г., 64,1 % у 2006 г.);

— прафесійных ведаў (50,8 % і 49,9 %);

— камп'ютарнай адукаванасці (37 % і 39,5 %);

— арганізатарскіх навыкаў (33,5 % і 32,2 %);

— навыкаў навуковай работы (30 % і 32,6 %);

— ведаў асноваў псіхалогіі (32,4 % і 27,6 %).

### *Структура матываў выбару БДУ студэнтамі IV курса*




Студэнтам IV курса таксама, як і студэнтам II курса, не хапае:

— ведаў замежных моваў (58,8 % і 54,9 %);

— прафесійных ведаў (43,2 % і 48,6 %);

— арганізатарскіх навыкаў (33,7 % і 37,2 %);

— камп'ютарнай адукаванасці (32,7 % і 28,4 %).

Аднак студэнтам IV курса ў меншай ступені, чым студэнтам II курса, бракуе ведаў асноваў псіхалогіі (15,6 % чацвёртакурснікаў у 2005 г. і 15 % у 2006 г.) і навыкаў навуковай работы (25,4 % у 2005 г. і 26,3 % у 2006 г.).

Навучанне ў ВНУ — двухбаковы працэс, у якім студэнты займаюць актыўную пазіцыю. Для паспяховага авалодання абранай прафесіяй пераважная большасць студэнтаў перадусім засвойваюць навучальную праграму, якую прапануе ВНУ, траціна студэнтаў самастойна вывучае дадатковую навуковую і навучальную літаратуру, частка студэнтаў наведвае дадатковыя заняткі, курсы, факультатывы (графікі 3, 4).

Асаблівая ўвага ў даследаванні надавалася праблемам самастойнай работы студэнтаў. Варта зазначыць, што большасць студэнтаў як II курса (81 % у 2005 г., 84,2 % у 2006 г.), так і IV курса (83,7 % у 2005 г., 81 % у 2006 г.) лічаць, што ў іх ёсць умовы і магчымасці працаваць самастойна. Пры гэтым найбольш высока свой узровень навыкаў самастойнай навучальнай работы ацанілі студэнты IV курса ў 2006 г. — 15,2 % (у 2005 г. — 9,8 %) у параўнанні са студэнтамі II курса — 8 % (у 2005 г. — 5,8 %).

Важна зазначыць, што студэнты IV курса больш за студэнтаў II курса займаюцца навукова-даследчай работай, сумяшчаюць навучанне з працай (падпрацоўкай) па спецыяльнасці, праходзяць стажыроўку, практыку на адпаведных прадпрыемствах, у фірмах, а таксама ўдзельнічаюць у алімпіядах, конкурсах, канферэнцыях (графікі 3, 4). Пры гэтым больш за палову студэнтаў II курса (64,5 % — 2005 г.; 59 % — 2006 г.) адказалі, што хацелі б займацца навукова-даследчай работай апрача напісання курсавых і дыпломных работаў.

Асноўнымі прычынамі, па якіх студэнты II курса не займаюцца навукова-даследчай работай, з'яўляюцца наступныя:

— ніхто не прапанаваў заняцца навуковай работай

### *Дзеянні студэнтаў II курса для паспяховага авалодвання спецыяльнасцю*




(48,1 % — 2005 г. і 56,3 % — 2006 г.);

— адсутнасць часу (23,9 % і 19,4 %);

— адсутнасць стымулу (20 % і 18,4 %).

Для студэнтаў IV курса характэрныя такія ж прычыны:

— адсутнасць стымулу (35,4 % — 2005 г. і 35,6 % — 2006 г.);

— ніхто не прапанаваў заняцца (29,5 % і 33,9 %);

— адсутнасць часу (20,3 % і 22,6 %).

Падчас маніторынгу высвятлялася думка студэнтаў пра арганізацыйна-метадычныя формы навучання, якія практыкуюцца на іх факультэтах. І ў 2005, і ў 2006 г. сярод дамінуючых формаў і метадаў навучання студэнты як другога, так і чацвёртага курса адзначылі лекцыі і семінары, а таксама тэставы кантроль і самастойную работу студэнтаў, прычым апошняя прымяняецца ў студэнтаў IV курса часцей (81,7 % у 2005 г., 84,1 % у 2006 г.), чым у студэнтаў II курса (74,6 % і 73,7 %, адпаведна).

### *Дзеянні студэнтаў IV курса для паспяховага авалодвання спецыяльнасцю*




Пры гэтым на розных курсах практыкуюцца розныя суадносіны іншых формаў і метадаў навучання. На IV курсе часцей прымяняюцца дзелавыя гульні, трэнінгі (19,3 % у 2005 г., 16,5 % у 2006 г.), індывідуальная работа з выкладчыкам (16,3 % у 2005 і 2006 г.), вытворчая (39,7 % у 2005 г. і 41,8 % у 2006 г.) і даследчая (32,4 % у 2005 г., 39,5 % у 2006 г.) практыка. На II курсе часцей выкарыстоўваюцца камп'ютарныя, тэлекамунікацыйныя тэхналогіі навучання (43 % у 2005 г., 40,6 % у 2006 г.).

Варта зазначыць, што студэнты II курса больш задаволеныя формамі і метадамі правядзення заняткаў (65,1 % у 2005 г., 69,8 % у 2006 г.), чым студэнты IV курса (55,5 % у 2005 г., 57 % у 2006 г.). Таксама другакурснікаў больш задавальняе і змест навучальных курсаў (59,3 % у 2005 г., 61,3 % у 2006 г.), чым чацвёртакурснікаў (48,7 % у 2005 г., 46,1 % у 2006 г.).

Больш за палову студэнтаў II і IV курсаў з усіх формаў і метадаў навучання найбольш плённымі называюць семінары, і амаль палова рэспандэнтаў — лекцыі. Астатнія формы і метады, якія ўжываюцца ў навучальна-адукацыйным працэсе, лічаць плённымі каля траціны студэнтаў.

Такім чынам, вынікі сацыялагічнага маніторынгу дазваляюць ахарактарызаваць Беларускі дзяржаўны універсітэт як прэстыжную навучальную ўстанову з высокім узроўнем выкладання, якая забяспечвае неабходную тэарэтычную падрыхтоўку па спецыяльнасці, высокую агульнакультурную эрудыцыю і ўменне самастойна папаўняць веды і выкарыстоўваць іх на практыцы. Для паспяховага авалодання прафесіяй студэнты БДУ не толькі асвойваюць навучальную праграму, якую прапануе ВНУ, але і самастойна вывучаюць дадатковую літаратуру. У якасці дамінуючых формаў і метадаў навучання ў БДУ практыкуюцца лекцыі і семінары, якія студэнты лічаць сёння найбольш прадуктыўнымі.

**Матэрыял пададзены Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ**

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ЗНАЁМСТВА З МІНСКАМ



Увесь кастрычнік ладзіліся экскурсіі па Мінску для іншагародніх студэнтаў-першакурснікаў. Арганізавала іх упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, каб азнаёміць маладых людзей з гістарычнай і гераічнай мінуўшчынай горада і яго цяперашнім днём.

Падчас экскурсіі па цэнтры горада першакурснікі знаёмяцца з старажытнымі будынкамі. Як альтэрнатыва гэтаму наступны прыпынак — Нацыянальная бібліятэка. Заключны пункт падарожжа па значных мясцінах — прыпынак каля Музея камянёў — музея пад адкрытым небам. Камяні з усёй Беларусі размешчаныя там у выглядзе карты краіны, а сцежкі сімвалізуюць рэкі.

**Святлана ДАЛГАНЮК**

**Фота Тамары СУВОРАВАЙ**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ГУКІ ЯПОНІІ

11 кастрычніка на факультэце міжнародных адносін БДУ быў праведзены канцэрт, прысвечаны музычнай культуры Японіі. Удзельнікі квартэта з Краіны ўзыходнага сонца пазнаёмілі студэнтаў нашага універсітэта са сваім унікальным мастацтвам гульні на като. Като — гэта агульная назва старадаўніх, вядомых яшчэ з III стагоддзя да н.э. доўгіх японскіх цытраў.

Выступленне квартэта было арганізавана пры падтрымцы Міжнароднага фонду распаўсюджвання японскай мовы і культуры "Japanese Foundation", які, дарэчы, запрашае выкладчыкаў японскай мовы для працы ў Белдзяржуніверсітэце.

Дабрачынныя канцэрты названага музычнага калектыву пройдуць у дзіцячых дамах, бальніцах нашай краіны і ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

# СУСТРЭЧА ФІЗІЁЛАГАЎ

Напрыканцы верасня на базе біялагічнага факультэта адбыўся чарговы, XI з'езд Беларускага таварыства фізіёлагаў (БТФ). У адну з найстарэйшых у Беларусі навуковых супольнасцяў уваходзяць навукоўцы-фізіёлагі Нацыянальнай акадэміі навук, міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя, спорту і турызму, сельскай гаспадаркі і харчавання. На з'езд прыехалі дэлегацыі з мінскага, віцебскага, гродзенскага, магілёўскага, гомельскага і горацкага аддзяленняў аб'яднання.

У справаздачным дакладзе праўлення былі падведзеныя вынікі працы за 5 гадоў, якія прайшлі пасля папярэдняга з'езду. За гэты час выйшлі 3 падручнікі, 38 манаграфій, 30 зборнікаў артыкулаў, 1414 артыкулаў у навуковых часопісах, 1359 тэзісаў дакладаў. Было адзначана, што кола традыцыйных навуковых распрацовак папоўнілася шэрагам новых прыярытэтных навуковых напрамкаў. На навуковым аддзяленні з'езда прагучала 17 пленарных дакладаў і прайшлі 2 постэрныя сесіі па найбольш актуальных праблемах сучаснай фізіялогіі, патафізіялогіі і сумежных дысцыплінах. Вялікі інтарэс выклікалі паведамленні акадэміка У. Гурына "Роля пурынергічных механізмаў у тэрмарэгуляцыі", акадэміка У. Мацюхіна "Эколага-фізіялагічныя праблемы мінімізацыі радыяцыйных уздзеянняў (метадалогія і базавыя асновы)", даклады членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі Л. Лабанка, Ф. Вісманта, А. Майсеенкі, У. Салтанава, прысвечаныя дасягненням клетачнай і інтэгратыўнай фізіялогіі. Прафесары А. Кубарка, М. Нечыпурэнка, С. Зіматкін, Э. Цітавец, А. Саладкоў, У. Зінчук, А. Бажко, У. Калюнаў прачыталі даклады, якія абагульнялі фундаментальныя і прыкладныя даследаванні па фізіялогіі ў клінічных установах і на кафедрах ВНУ.

Дарэчы, больш за палову ўдзельнікаў з'езду склалі студэнты і аспіранты і маладыя навукоўцы. А гэта дае надзею старэйшаму пакаленню фізіёлагаў.

**А. ЧУМАК,**
**загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл,**
**доктар біялагічных навук**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# У ФОКУСЕ ЎВАГІ: СТУДЭНЦКІ ПСІХАЛАГІЧНЫ КЛУБ

***У кожнага чалавека, незалежна ад узросту, прафесіі, сацыяльнага статусу, узнікаюць пытанні самапазнання, самарэгуляцыі, пытанні, якія датычаць яго ўзаемаадносін з іншымі людзьмі. Цешыць тое, што многія імкнуцца знайсці адказы на гэтыя пытанні.***

З ініцыятывы студэнтаў 24 сакавіка 2004 г. на базе псіхалагічнай службы БДУ быў створаны студэнцкі псіхалагічны клуб. Гэта адкрытае аб'яднанне, членам якога можа стаць кожны, у каго ёсць інтарэс да псіхалогіі, жаданне знайсці аднадумцаў, пагаварыць са спецыялістамі. Псіхалагічны клуб ставіць сабе за мэту фарміраваць і развіваць псіхалагічную кампетэнтнасць студэнтаў, павышаючы іх адукацыйны ўзровень. Заўважым, што асноўнымі ініцыятарамі і самымі актыўнымі удзельнікамі клуба з'яўляюцца студэнты непсіхалагічных спецыяльнасцей. Кожная сустрэча членаў клуба прысвячаецца дакладнай тэме, выбранай студэнтамі. Самі сустрэчы могуць уключаць элементы тэарэтычных паведамленняў, праходзіць у форме семінараў-практыкумаў з выкарыстаннем інтэрактыўных формаў паказу матэрыялу або ў форме трэнінгавых заняткаў. Сустрэчы адбываюцца не радзей, чым адзін раз на месяц (як правіла, гэта апошні чацвер месяца), за выключэннем канікул і часу сесіі. Тыя, хто па якіх-небудзь прычынах не змог прыйсці на сустрэчу, але палічыў тэму цікавай, могуць падаць заяву і атрымаць падрыхтаваны спецыялістамі пакет матэрыялаў у электронным выглядзе.

Клуб — гэта псіхалагічная інфармацыйная прастора, у якой гарантуецца дакладнасць і абгрунтаванасць псіхалагічных ведаў, іх даступнасць для студэнцкай аўдыторыі. Члены студэнцкага псіхалагічнага клуба таксама з'яўляюцца ўдзельнікамі рэгулярных семінараў, што ладзяцца на базе САК "Брыганціна".

У 2005/2006 навучальным годзе студэнцкі псіхалагічны клуб заняў другое месца ў конкурсе грантаў "Лепшы маладзёжны праект БДУ".

Запрашаем старых і новых сяброў! Больш поўная і актуальная інфармацыя — на стэндах педагогаў-псіхолагаў у інтэрнатах і на факультэтах.

Месца знаходжання клуба: вул. Кастрычніцкая, 2 (інтэрнат № 2), пакой 308.

**Педагог-псіхолаг**
**В.В. ШАПАШНІКАВА**

# БДУ ў СМІ Беларусі

Юбілей народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Неруш" — "Неруш" ранішні — суквецце Гладкай" **("Культура", 14—20.10).**

Наведванне студэнтамі БДУ Нацыянальнага сходу Палаты прадстаўнікоў РБ – "Студенты вошли в аудитории вместе с... депутатами" **("Рэспубліка", 18.10).**

Пра прафесара БДУ Вольгу Якушка — "Хамелеон из чемодана» **("Советская Белоруссия", 18.10).**

Харчаванне студэнтаў — "Кушать подано, господа студенты!» **("Знамя юности", 13.10).**

Тыдзень маці ў БДУ — "БГУ сердечно поздравляет мам" **("Рэспубліка", 10.10)**; "На поклон — в Жировичи" **("Минский курьер", 12.10)**; "Мацярынскае веча ў БДУ" **(Звязда", 18.10).**

Міжнародная навукова-практычная канфэрэнцыя "Ад інфармацыйнага грамадства да грамадства ведаў: бібліятэка ВНУ ў XXI стагоддзі" да 85-годдзя Фундаментальнай бібліятэкі БДУ — "Какой быть библиотеке вуза в XXI веке?" **("Рэспубліка", 11.10)**; "Студэнт + бібліятэка =..." **(Звязда", 13.10)**; "Бібліятэка ВНУ ў стагоддзе электроннай інфармацыі" **("Настаўніцкая газета", 17.10).**

Візіт кіраўнікоў беларускіх ВНУ на чале з рэктарам БДУ Васілём Стражавым у Кітай — "Руководители белорусских вузов — в Китае" **("Рэспубліка", 11.10)**; "Якасць вышэйшай адукацыі абмяркуюць у Кітаі" **("Настаўніцкая газета", 10.10).**

Міжвузаўская спартакіяда — "Состязались преподаватели" **("Вечерний Минск", 12.10);**

Вучэнні па грамадзянскай абароне ў БДУ — "Необычная акция пройдет сегодня в Белгосуниверситете..." **("Вечерний Минск", 12.10);**

III міжнародны фэстываль студэнцкай тэатральнай творчасці "Тэатральны куфар—2006" — "Кому достанется "Большой куфар"?" **("Рэспубліка", 04.10)**; "Трамвай исполнения желаний" **("Минский курьер", 04.10)**; "Фестиваль помог открыть... Пьеро" **("Вечерний Минск", 05.10)**; "Тэатральны куфар—2006" подвел итоги" **("Вечерний Минск", 10.10)**; "Школяры? Нет, актеры!" **("Знамя юности", 06.10)**; "Театральный зачет" **("Советская Белоруссия", 12.10)**; "Тэатральны куфар вызначыў пераможцаў" **(Звязда", 13.10)**; "Асцярожна, філфак БДУ!" **("Настаўніцкая газета", 10.10)**; "Солдаты нюхали кокаин в ДК профсоюзов" **("БелГазета", 09.10).**

Магістратура эканамічнага факультэта — "Ці можа фізік стаць менеджэрам па продажы?" **("Настаўніцкая газета", 07.10).**

Вынікі ўступнай кампаніі — "Па выніках уступнай кампаніі" **("Літаратура і мастацтва", 06.10).**

Узнагароды БДУ за навуковыя распрацоўкі на 9-й міжнароднай выставе-кангрэсе "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" ў Санкт-Пецярбургу — "Навуковыя распрацоўкі БДУ атрымалі ўзнагароды" **("Настаўніцкая газета", 05.10)**; "Пять золотых и три серебряных медали..." **("Советская Белоруссия", 05.10).**

Працаўладкаванне — "Работа для студента" **("Советская Белоруссия", 04.10).**

Падвышэнне аплаты за навучанне ў БДУ (па матэрыялах прэс-канферэнцыі рэктара БДУ Васіля Стражава) — "Образование стало дороже» **("Вечерний Минск", 02.10)**; "Знания обходятся все дороже" **("Белорусы и рынок", 02.10)**; "Счастье не в стипендии, а... в ее размере" **("Аргументы и факты в Беларуси" № 40, 2006)**; "Государство дотирует и "бюджетников" и "платников" **("7 дней", 05.10)**; "Факультет прикладной математики и информатики БГУ лучший в мире!" **("Компьютерные вести", 05.10)**; "Дарагі дыплом" **("Народная воля", 07.10).**

Перамога студэнткі IV курса факультэта міжнародных адносін БДУ Юліі Абрагімовіч у конкурсе на лепшае веданне японскай мовы — "Урок японского" **("Минский курьер", 03.10)**; "Студентка БГУ — знаток японского" **("Вечерний Минск", 04.10)**; "Студентка 4-го курса факультета международных отношений БГУ Юлия Абрагимович..." **("Рэспубліка", 04.10)**; "Што семачкі..." **(Звязда", 07.10).**

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

**Падрыхтавала прэс-служба БДУ**

АБ'ЯВЫ


**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, замежнай літаратуры, славянскіх літаратур;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, рускай літаратуры, гісторыі беларускай мовы, агульнай фізікі, фізікі паўправаднікоў і наназлектронікі, ядзернай фізікі, агульнага землязнаўства;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэлебачання і радыёвяшчання, біяфізікі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: перыядычнага друку, гісторыі беларускай літаратуры, нямецкага мовазнаўства.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г.Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

**"ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЛАБАРАТОРЫЯ МОЦНАТОКАВАЙ ЭЛЕКТРОНІКІ

старшы навуковы супрацоўнік (2 чалавекі);

навуковы супрацоўнік (1 чалавек).

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**Беларуская дыялекталогія ў табліцах і схемах. У 2 частках. Ч. 1. Фанетыка.** У выглядзе схем і табліц кніга падае сістэматызавана і сцісла інфармацыю, неабходную для вывучэння дыялектнай фанетыкі (націскны і ненаціскны вакалізм, кансанатызм).

*Шумейко М.Ф.* **Археография.** Курс лекцый складаецца з трох раздзелаў




— "Тэарэтычныя праблемы археаграфіі", "Гісторыя беларускай археаграфіі", "Методыка публікацый дакументаў як гістарычных крыніц".

**Краткий англо-русский словарь юридических терминов.** Слоўнік прызначаны для студэнтаў, якія спецыялізуюцца ў правазнаўстве, эканамічным праве, паліталогіі.

**Краткий англо-русский словарь экономических терминов.** Выданне прызначана для студэнтаў, якія спецыялізуюцца ў эканоміцы, эканамічнай тэорыі, фінансах і крэдыце.

**Краткий англо-русский словарь исторических терминов.** У кнігу ўвайшла тэрміналагічная лексіка, неабходная для работы з гістарычнай літаратурай на англійскай мове.

**Краткий англо-русский словарь географических терминов.** Слоўнік прызначаны для студэнтаў, якія спецыялізуюцца ў геаграфіі, геалогіі, экалогіі, ГІС.

**Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918—1941): Хрэстаматыя для студэнтаў філалагічнага факультэта. У 2 частках. Ч. 1.** У хрэстаматыю ўключаны публікацыі і матэрыялы, якія мелі вялікае значэнне для развіцця лінгвістычнай думкі ў Беларусі ў 1918—1941 гадах. У першай частцы разглядаюцца пытанні тэрміналогіі, лексікаграфічнай дзейнасці, распрацоўкі правапісу ў 1920-я гады, граматычных норм і канцэпцыі фарміравання літаратурнай мовы.

*Градюшко А.А.* **Основы журналистики. Организация работы редакции СМИ.** Навучальна-метадычны комплекс уключае праграму курса, канспект лекцый, праграму лабараторных заняткаў, заданні для самастойнай работы, тэставыя заданні, пытанні да экзаменаў, карысныя Інтэрнэт-спасылкі.

*Дмитриев Е. И.* **Политический анализ в журналистской практике.** У канспекце лекцый выкладаюцца асноўныя палажэнні методыкі палітычнага аналізу ў журналісцкай практыцы, якая разглядаецца як навуковы напрамак і навучальная дысцыпліна.

*Некриш В.В., Сидоренко В.П.* **Социально-экономическая география стран СНГ.** Практыкум падае тэмы заняткаў, правядзенне якіх прадугледжана камбінаваным метадам (які ўключае самастойнае засваенне навучальнага матэрыялу), абмеркаванне базавых пытанняў, індывідуальную практычную работу, праверку выкананага задання.

*Соловей Т.Г.* **Политические партии и партийные системы.** У навучальным дапаможніку раскрываюцца сутнасць і функцыі палітычных партый, даецца характарыстыка сучасных партыйных сістэм.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ВІНШУЕМ!

# "НЕРУШУ" — ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ!

Фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш" быў заснаваны ў 1980 г. Юбілей павінен быў адбыцца яшчэ вясной мінулага года, але святкуюць яго толькі зараз. Тыя, хто наведаў святкаванне, незадаволенымі не засталіся: на свята да калектыву прыехалі сябры ансамбля з Нарвегіі, Польшчы і Кіпра. 19 кастрычніка ў ліцэі БДУ адбыўся канцэрт, а 20-га ў актавай зале галоўнага корпуса — капуснік.

Сёння ў "Нерушы" 25 чалавек пад кіраўніцтвам Заслужанага дзеяча культуры Валянціны Гладкай. Пры заснаванні ў ансамбль уваходзілі выкладчыкі і студэнты БДУ, крыху пазней да іх далучыліся прадстаўнікі іншых універсітэтаў. Удзельнікі калектыву збіралі народную музыку, песні, абрады і звычаі падчас фальклорных экспедыцый па ўсіх рэгіёнах Беларусі, а потым выкарыстоўвалі здабыты матэрыял пры стварэнні шматлікіх праграм. Так, "Калядныя гульні", "Беларускае вяселле" — своеасаблівыя інсцэніроўкі, у якіх адлюстроўваюцца важныя падзеі з жыцця беларускага народу. За плённую творчую працу і майстэрства ў 1985 г. ансамблю было нададзена званне "Народны". На гэтым пералік узнагарод не заканчваецца. "Неруш" неаднаразова атрымліваў прызы і прэміі за ўдзел у конкурсах па ўсім свеце:

1985 г. — перамога ў Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў у Балгарыі;

1995 г. — фестывалі ў Аўстрыі, Егіпце, Нарвегіі;

1997 г. — Тайвань, Нарвегія;

2000 г. — Францыя, Японія (Сусветная фалькларыяда);

2004 г. — Нарвегія.

У 1999 г. ансамбль атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Беларусі "За ўклад у развіццё міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь".

Ансамбль захоўвае мастацкія традыцыі продкаў. Адзенне, выкананае ўручную лепшымі майстрамі нашай краіны, музычныя інструменты: цымбалы, гармонік, жалейка, дуда і іншыя, — сведчаць пра цікаўнасць ансамбля да мінуўшчыны.

**Лейла ІСМАІЛАВА**



## БДУ СМЯЕЦЦА

Прафесар — студэнту:

— У вашай курсавой рабоце вельмі шмат арфаграфічных памылак. Я дзіўлюся: як адзін чалавек мог нарабіць столькі?!

— І зусім не адзін! Мне ў інтэрнаце ўвесь пакой дапамагаў.

***

Прафесар пытаецца ў студэнта:

— Ці не назавеце вы мне сталіцу Венесуэлы?

— Ведаеце, мне вельмі шкада, але я таксама не ведаю...

***

— Якую форму мае Італія на геаграфічнай мапе?

— Форму гумовага бота.

— Правільна, бота. Але чаму гумовага?

— Таму што гэты бот з усіх бакоў аточаны вадой.

***

— Скажы, экзаменатар дазваляе карыстацца канспектам?

— Канечне! Толькі ты не паказвай яго...

***

Прафесар — студэнту:

— Які самы выдатны прадукт падарыла нам хімія на сённяшні дзень?

— Бландзінак!

***

Студэнтка размаўляе з маці:

— Нават не ведаю, якую сукенку апрануць... У блакітнай я ўжо атрымала двойку...

— Паспрабуй апрануць ружовую.

***

— Вось здамо зімовую сесію — у снежкі пагуляемся!

— А дзе вы ўлетку снег знойдзеце?

***

Студэнты бываюць добрыя і вельмі добрыя. Астатніх даводзіцца адлічваць.

***

Студэнт просіць экзаменатара:

— Задайце мне яшчэ два-тры пытанні, калі ласка!

— Пра што ж я ў вас буду пытацца, калі вы нават элементарнага не ведаеце?!

— Так, але ж дома я змагу сказаць, што засыпаўся на дадатковых пытаннях.

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ТЫДЗЕНЬ З МЕЛЬПАМЕНАЙ

***250 тэатралаў з Беларусі, Літвы, Расіі, Грэцыі, Фінляндыі, Германіі, Чэхіі, Ірана і Славеніі ў рамках фестывалю студэнцкай творчасці "Тэатральны куфар — 2006" зрабілі са звычайнага восеньскага тыдня сапраўднае свята Мельпамены.***

У гэтым годзе фестываль "Тэатральны куфар" святкуе свой маленькі юбілей: ён ужо тры гады радуе прыхільнікаў тэатральнага майстэрства. Сёлета фестываль прысвячаецца і яшчэ аднаму юбілею — свайго арганізатара БДУ, якому ў гэтым годзе спаўняецца 85.

Ідэя трэцяга "Тэатральнага куфра" — не толькі пошук новага, але і захаванне традыцый. А за тры гады пэўныя адметнасці ўжо ўсталяваліся. Так, 2 кастрычніка свята пачалося з ужо знаёмай перфоманс-акцыі даўжынёю ў 8 кіламетраў. Рыцары з сярэднявечча, манахі, полацкія князі і іншыя ўдзельнікі фестывалю праехаліся ва ўпрыгожаным трамвайчыку з Зялёнага Лугу да ліцэя БДУ. На прыпынках яны разыгрывалі невялічкія сцэнкі, запрашаючы тым самым мінчукоў на "Тэатральны куфар". Адкрыў фестываль тэатр з горада Эспу (Фінляндыя) спектаклем у стылі неамадэрн "П'еро ў глабалізацыі".

Трэба адзначыць, што праграма "Куфра" была вельмі насычанай: па чатыры спектаклі ў дзень на трох мінскіх пляцоўках. Склалася ўражанне, што на працягу тыдня акрамя тэатру больш нічога не было. За 5 дзён гледачы пабачылі 18 разнастайных спектакляў на розны густ. Была тут і гістарычная тэматыка Вялікага княства Літоўскага, і румынскія міфы, і еўрапейская класіка, сучасная беларуская драматургія, незвычайнае паяднанне ў межах адной пастаноўкі Блока з Пялевіным і Шэкспіра з Вампілавым і Дастаеўскім.

За гады свайго існавання фестываль стаў жаданым і чаканым госцем. Пра гэта кажуць аншлагі на спектаклях, актыўнае галасаванне за лепшы з іх, абмеркаванні пастановак студэнтамі ў сценах нашай alma mater.

Арганізатары далі унікальную магчымасць удзельнікам "Куфра" пераймаць вопыт не толькі адзін у аднаго, але і ў сапраўдных прафесіяналаў. Цэлы тыдзень пачынаючым акцёрам давалі майстар-класы знакамітыя тэатральныя дзеячы і педагогі з Грэцыі, Швейцарыі, Вялікабрытаніі, Германіі і ЗША. Яны вучылі іх імправізацыі ў тэатры, тэатру вобразаў і фізічных дзеянняў, амерыканскай методыцы акцёрскай гульні, сучаснаму падыходу да адаптацыі сістэмы Станіслаўскага і інш.



Не трэба забываць, што фестываль — гэта найперш усё-такі конкурс, дзе ёсць свае пераможцы. Міжнароднае незалежнае журы не пакрыўдзіла ні аднаго з удзельнікаў: кожнай трупе быў уручаны дыплом з адзначэннем у ім нейкай асаблівай рысы іх пастаноўкі. Журы падаравала тры маленькія "Куфры": "За лепшы спектакль" — тэатру-студыі "Palepe" (Літва) за пастаноўку "Касцюм" паводле твору Рэя Брэдберы, "За лепшую мужчынскую ролю" — Штэфану Грэбелю і Паўлу Багатке з Берліну (спектакль "Эмігранты") і "За лепшую жаночую ролю" — Барбары Ялішык са славенскай трупы (спектакль "Апошняя інструкцыя").

У гледачоў было сваё галасаванне і свой пераможца. Галоўны вялікі куфар атрымаў тэатр "На філфаку" за спектакль "Асцярожна, жанчыны!" паводле п'есы Андрэя Курэйчыка. Цікава, што ў мінулым годзе гэты тэатр стаў лепшым на думку журы. Дарэчы, узнагарода журы за "Лепшую жаночую ролю другога плана" дасталася актрысе Вользе Караленак, якая таксама грала ў спектаклі "Асцярожна, жанчыны!" Яшчэ адну ўзнагароду прадстаўнікі БДУ забралі ў намінацыі "За лепшую рэжысуру": яе атрымаў рэжысёр Народнага студэнцкага драматычнага тэатра БДУ "На балконе" Сяргей Турбан (пастаноўка "Плачу за ўсё!").





Тэатральны фестываль — гэта унікальная магчымасць у межах аднаго горада пазнаёміцца з шырокай панарамай разнастайных пастановак з розных куткоў свету. І ўдзельнікі, і гледачы спадзяюцца, што такі культурны абмен не страціць сваёй моцы і ў наступным годзе збярэ іх разам на чацвёртым "Тэатральным куфры".

**Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фотаздымкі аўтара і Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

26 кастрычніка 2006 года
Падпісана да друку 25.10.2006 г.
Зак. 960. Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 2.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by